ПАД ЗАСТУПНІЦТВАМ ПЯТРА І ПАЎЛА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так, 18 кастрычніка 1809 года каля графскага палаца протаіерэй Іаан Конанавіч Грыгаровіч заклаў каменную царкву ў гонар святых апосталаў Пятра і Паўла. Для яе будаўніцтва патрабавалася цэгла: на беразе Іпуці спецыяльна адкрылі цагляную вытворчасць, з якой па водным шляху пастаўлялі будаўнічы матэрыял у Гомель. Аднак будаўніцтва храма па розных прычынах зацягнулася. Перашкодзіла і Айчынная вайна 1812 года, хаця мястэчка не пацярпела ад баявых дзеянняў.

Аднавілася будаўніцтва Петра-Паўлаўскага храма ў 1815 годзе, а цалкам завершана — у 1824-м. Граф Румянцаў даставіў з Санкт-Пецярбурга шмат богаслужэбных кніг і каштоўнае царкоўнае ўбранне, а таксама часціцы мошчаў шырокашанавальных святых. Калі ў 1826 годзе Мікалай Пятровіч спачыў у Пецярбургу, паводле завяшчання, прах пахавалі ў левым прыдзеле Петра-Паўлаўскай царквы ў Гомелі.

З Мікалаем Румянцавым звязаны і лёс першага настаяцеля гомельскага храма — знакамітага навукоўца, гісторыка, краязнаўца, сына протаіерэя Іаана Конанавіча Грыгаровіча — Іаана Іаанавіча Грыгаровіча. У храме, якому ў 1872 годзе быў афіцыйна нададзены статус сабора, у розныя часы пабывалі многія знакамітыя людзі. Сярод іх — імператары Мікалай I, Аляксандр II з жонкай Марыяй Аляксандраўнай, вялікія князі Канстанцін, Міхаіл, Мікалай. Петра-Паўлаўскі сабор звязаны і з імем першага епіскапа Гомельскага (1907—1912) — на той момант будучага свяшчэннамучаніка — Мітрафана (Краснапольскага).

30 ГАДОЎ АНТЫПРОПАВЕДЗЯЎ

Паслярэвалюцыйная гісторыя храма была традыцыйнай для таго часу. У першай палове 1931 года богаслужэнні ў саборы спыніліся, і 27 лістапада ён быў афіцыйна зачынены. Некалькі гадоў прастаяў у бяздзейнасці, і толькі ў 1935 годзе ў яго будынку размясціўся аддзел гістарычнага музея, а з 1939 года і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся антырэлігійны аддзел. На працягу амаль 30 гадоў у будынку чыталі толькі антырэлігійныя прамовы.

— З пачаткам нямецкай акупацыі, калі музей быў эвакуіраваны, сабор зноў стаў выконваць сваё першапачатковае прызначэнне, — расказвае **старшыня Камісіі па кананізацыі святых Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, кандыдат багаслоўя, протаіерэй Аляксандр ЛАПУШАНСКІ.** — Як вядома, акупацыйная фашысцкая адміністрацыя першапачаткова дазваляла вернікам займаць былыя царкоўныя будынкі, служыць святарам, але потым стала кантраляваць гэты працэс і адкрыта ўмешвацца ў яго. У сярэдзіне 1942 года ў Гомель прыбыў архімандрыт Жыровіцкага манастыра Серафім (Шахмуць) (праслаўлены як прападобнамучанік).

Прыкметную ролю ў арганізацыі царкоўнага жыцця ў Гомелі таго часу адыграў протаіерэй Мікалай Іванавіч Гейхрох, які вярнуўся да служэння падчас нямецкай акупацыі. Па яго ўспамінах сталі вядомыя шматлікія падзеі, якія адбыліся ў царкоўным жыцці акупаванага Гомеля. Так, пасля ўступлення немцаў аднавіліся богаслужэнні ў Петра-Паўлаўскім кафедральным саборы. Але па чарзе ў ім сталі служыць лютэране, пасля іх — каталікі і толькі потым — праваслаўныя. Такое становішча выклікала незадаволенасць у мясцовага насельніцтва, бо сабор першапачаткова з'яўляўся праваслаўным і ніколі не быў кірхай ці касцёлам. Менавіта протаіерэй Мікалай Гейхрох не пагадзіўся з такой сітуацыяй і дабіваўся, каб сабор пакінулі праваслаўным вернікам.

З набліжэннем фронту ў лістападзе 1943 года нямецкія войскі ўзвялі абарончыя збудаванні ў межах горада па правым беразе Сожа, у тым ліку і на тэрыторыі цяперашняга палацава-паркавага ансамбля. Відавочна, што ў такіх умовах богаслужэнні ў саборы весціся не маглі.

Адразу пасля нямецкай акупацыі, у 1944 годзе, на сваё першае месца служэння ў Гомельскі сабор прыбыў Віталь Баравой, у далейшым вядомы маскоўскі прафесар-багаслоў.



Петра-Паўлаўскі сабор у пасляваенныя гады звязаны з гісторыяй лёсу і яшчэ аднаго вядомага праваслаўнага падзвіжніка. Так, у 1959 годзе настаяцелям Петра-Паўлаўскага сабора прызначылі протаіерэя Васіля Данілавіча Капычку. Новаму настаяцелю не адразу ўдалося аднавіць богаслужэнні ў зачыненым саборы. Сітуацыю з дзейнасцю храма ўскладняла адсутнасць клірыкаў-памочнікаў, якіх да служэння самачынна не дапускалі самі прыхаджане.

МАЯТНІК НА МЕСЦЫ ПАНІКАДЗІЛА

Улетку 1960 года выканкам Цэнтральнага раёна Гомеля ў сувязі з добраўпарадкаваннем набярэжнай Сожа прыняў рашэнне знесці царкоўную «вартавую», у якой пражываў протаіерэй Капычка. З горам папалам «кватэрнае пытанне» для настаяцеля сабора ўдалося вырашыць станоўча.

— Але ў гэты час райвыканкам, «ідучы насустрач пажаданням працоўных г. Гомеля», звярнуўся ў аблвыканкам з хадайніцтвам закрыць сабор, «захоплены ў канцы 1941 года вернікамі», і перадаць яго будынак пад ранейшае даваеннае прызначэнне — музей з маятнікам Фуко. Хадайніцтва падтрымалі з матывіроўкай, што «закрыццё сабора не пазбаўляе вернікаў умоў для адпраўлення рэлігійных абрадаў, бо ў г. Гомелі функцыянуе другая царква ўмяшчальнасцю 1500—2000 чалавек, якую і могуць наведваць вернікі саборнай парафіі», — звяртае ўвагу Аляксандр Лапушанскі. — 30 кастрычніка 1960 года ў саборы адбылася апошняя літургія.

Пасля закрыцця сабора Палеская Свята-Мікалаеўская царква на доўгі час стала адзіным праваслаўным храмам у горадзе. Протаіерэй Васіль Данілавіч Капычка стаў яго настаяцелям.

У адабраным саборы планетарый, які хранічна сябе не акупляў, праіснаваў з 1962 да 1985 года.

ТЫСЯЧЫ ПОДПІСАЎ У ПАДТРЫМКУ

— Пасля шматлікіх лістоў і зваротаў гомельскай праваслаўнай абшчыны ў розныя дзяржаўныя органы 28 верасня 1989 года пусты будынак сабора вярнулі вернікам, — згадвае Аляксандр Лапушанскі. — Значную ролю ў няспынным хадайніцтве аб вяртанні храма адыграла гамяльчанка Марыя Васільеўна Богуш, якая напісала на працягу 1987—1989 гадоў больш за сотню лістоў і тэлеграм, пад некаторымі з іх стаяла да чатырох тысяч подпісаў. Гэтыя лісты падпісваліся не толькі жыхарамі Гомеля, але і іншых гарадоў і вёсак, а таксама шэрагам грамадскіх дзеячаў і народных дэпутатаў рознага ўзроўню. З Палескай Свята-Мікалаеўскай царквы на пасаду настаяцеля сабора быў пераведзены протаіерэй Феадор Харык. Памочнікамі саборнага настаяцеля былі прызначаны протаіерэй Пётр Захаравіч Поўны і іерэй Георгій Васільевіч Тур.

Протаіерэй Феадор Харык адчыніў дзверы храма і ўбачыў, які там панаваў беспарадак, груды смецця. Спачатку адслужылі падзячнае богаслужэнне, пасля вернікі прыступілі да ачысткі будынка, навядзення парадку. Ад людзей паступалі грашовыя сродкі і будаўнічыя матэрыялы, многія аказвалі фізічную дапамогу. Такое руплівае імкненне дазволіла ўжо 7 студзеня 1990 года, пасля трыццацігадовага перапынку, адслужыць у саборы першую літургію.

У ліпені 1990 года Свяшчэнным Сінодам РПЦ у межах Гомельскай вобласці была адроджана Гомельская епархія. Кіруючым архіерэем прызначылі епіскапа Арыстарха (Станкевіча), якому і давялося аднаўляць дзейнасць Гомельскай кафедры, адраджаць Петра-Паўлаўскі сабор у 1990-х гадах. У 1992-м, пасля ўтварэння Тураўскай епархіі, уладыка Арыстарх стаў епіскапам Гомельскім і Жлобінскім. А Гомельскі сабор ізноў набыў сваё ранейшае кафедральнае значэнне.

У жніўні 2007 года тут адбылася знамянальная падзея для праваслаўных вернікаў — праслаўленне ў ліку мясцовашанаваных святых Беларускай праваслаўнай царквы прападобнай Манефы Гомельскай. Мошчы гэтай заступніцы гамяльчан перад Богам сёння знаходзяцца ў левым прыдзеле сабора. На тым месцы, дзе ў саборы былі пахаваны астанкі графа Мікалая Румянцава (былі хутчэй за ўсё знішчаны), адкрыта памятная дошка, а аб апошняй гомельскай княгіні Ірыне Паскевіч нагадвае яе бюст, устаноўлены на месцы першага яе пахавання каля сцен сабора.

З 2012 года ў сэрцы Гомельскай епархіі — Свята-Петра-Паўлаўскім саборы служыць архіерэй — заснавальнік Свята-Іаана-Кармянскага жаночага манастыра Добрушскага раёна, былы епіскап Тураўскі і Мазырскі ўладыка Сцяфан (Нешчарэт).

Багатая гісторыя і архітэктура ўзведзенага больш за 200 гадоў таму сабора да нашых дзён нікога не пакідае абыякавым.

— Але сёння Петра-Паўлаўскі сабор — вельмі значны для жыцця ўсяго рэгіёна ў цэлым, вялікі духоўна-асветніцкі цэнтр, — падкрэслівае Аляксандр Лапушанскі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

СЛАЎНАЯ СЛОЎНАЯ МІСІЯ

У Дзень славянскага пісьменства каля Мінскага замчышча згадвалі святых роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія ды асветнікаў зямлі беларускай

24 мая ад Свята-Духава кафедральнага сабора ў Мінску рушыла шэсце да таго месца, дзе калісьці пачынаўся горад Мінск. У гонар свята — Дня славянскага пісьменства — прайшло асаблівае ўрачыстае богаслужэнне і малебен у гонар святых братоў Кірыла і Мяфодзія, якія паходзілі з грэчаскага горада Салуні. Абодва прынялі манаства, абодва ў IX стагоддзі мелі асаблівую місію — несці святло Святога Пісання славянам. Царква разумела неабходнасць народаў маліцца на сваіх мовах, для таго спачатку кнігу трэба было перакласці. Каб перадаць тэкст Евангелля, Кірыл стварыў першы славянскі алфавіт...

Згадка пра гэта прагучала ў пропаведзі: браты салунскія далі магчымасць дакрануцца да святла Божай любові. Дзякуючы ім мы можам чытаць Святое Пісанне і разумець вялікія словы, якія нам пакінуў Гасподзь. Калі цар Расціслаў запрасіў братоў з Салуні ў Маравію, то яны, вывучыўшы мясцовыя славянскія дыялекты, падаравалі прыгажосць Богаслужэння і аб'ядналі розныя плямёны вакол Чашы. А сёння мы маем магчымасць пісаць, чытаць і духоўна наталяцца дзякуючы справе вялікіх братоў Мяфодзія і Кірыла, якія стаялі каля вытокаў нашага пісьменства...

Прайшоўшы па мосце над вуліцай Няміга (нібыта здзейсніўшы палёт у часе над нябачнай рэчкай), шэсце на чале з абразам святых спынілася ля падмурка Замкавай гары. Тут знаходзілася старажытнае замчышча, тут жылі і будавалі горад нашы продкі. Тут захоўваюцца сляды першага ў гісторыі горада старажытнага каменнага храма, які існаваў з XI стагоддзя. Менавіта тут адбыўся малебен і у майскі дзень XXI стагоддзя, у якім узялі ўдзел святары, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і ўстаноў культуры, вернікі.

Аднак свята гэтае ўнікальнае тым, што выходзіць за межы Царквы, яно мае значэнне наогул для культуры, як і для любога чалавека ў Беларусі, які ўмее пісаць і чытаць. Гэта адзначыў у віншавальным слове **намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Сяргей ГЕРАСІМЕНЯ:**

— Спакон веку ўся мудрасць і веды народаў перадаваліся з вуснаў у вусны. Адкрыццё пісьменнасці і ў далейшым — кнігадрукавання адкрыла перспектывы для захавання культурнай і духоўнай спадчыны чалавецтва. Вялікая спадчына, якую пакінулі славянскім народам асветнікі, браты Мяфодзій і Кірыл, бясцэнная. Пісьменнасць адкрыла магчымасці для развіцця культуры, навукі, творчасці славянскіх народаў... Беларусь — радзіма выдатных асветнікаў, дзеячаў культуры сусветнага ўзроўню. Багатая спадчына сыноў і дачок Беларусі, асветнікаў Ефрасінні Полацкай, Кірыла Тураўскага, Сімяона Полацкага і іншых значная для кожнага беларуса з дзяцінства. Іх працы з'яўляюцца невычэрпнымі крыніцамі ведаў і мудрасці, што беражліва захоўвае беларускі народ...

Выступоўца падкрэсліў асаблівую ролю Беларускай праваслаўнай царквы ў захаванні духоўна-маральных традыцый на нашай зямлі. Адзначыў, што асаблівы дух яднае ўсіх славян, агульнае гістарычнае мінулае — падмурак для таго, каб шукаць і знаходзіць шляхі ўзаемаразумення. Гэты дух сябе праяўляў неаднойчы ў гісторыі і ў суровым ваенным ліхалецці, калі мір здабываўся каласальнымі чалавечымі высілкамі. Беларускі народ і цяпер імкнецца захаваць як аснову міру і дабрабыту досвед, заснаваны на высокіх каштоўнасцях і любові да сваёй зямлі.

У свецкім жыцці звычайна робіцца акцэнт на тым, што здабыткам братоў Мяфодзія і Кірыла з'яўляецца азбука, якую яны падарылі славянскім народам. Але галоўным для іх была пропаведзь Евангелля. Святыя разумелі, што вуснае слова можна сказіць ці перадаць недакладна, таму стварылі азбуку і пісьменства — каб сэнс Святога Пісання мог спасцігнуць кожны, тым самым атрымаць штуршок да ўдасканалення. Пра тое, што дзякуючы святым адбыўся «духоўны пераварот» у жыцці славянскіх народаў, казала **другі сакратар Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Марына ЯГОРАВА.**

Праўда, за стагоддзі мовы славянскіх народаў сталі істотна адрозніваца адна ад другой. Але ў богаслужэнні захаваная і выкарыстоўваецца менавіта царкоўнаславянская мова, на якую калісьці было перакладзена Святое Пісанне.

Блаславенне і вітанне ад **мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі** перадаў **епіскап Нясвіжскі Аўксенцій, вікарый Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.** Прагучала і пажаданне:

— Каб мы ніколі не забывалі подзвігу роўнаапостальных братоў Кірыла і Мяфодзія, тое, што ім прыйшлося выцерпець, каб даць нам святло евангельскай веры. Яны разумелі, што ў мове заключаны сэнсы, у кожным слове ёсць таемны змест, які мы разумеем на ўзроўні глыбіннай свядомасці. Сёння ёсць спробы спрасціць мову, спробы падмены сэнсаў. Таму асаблівае пажаданне да моладзі: не спрашчаць мову, старацца больш чытаць літаратуры, у якой раскрываюцца важныя паняцці: вера, надзея, любоў, мужнасць, смеласць, міласэрнасць. І гэта не проста словы, а сэнс нашага жыцця.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2024.Ч.002.00055** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by.

Продавец: открытое акционерное общество «Витебскоблавтотранс», 210601, г. Витебск, ул. Софьи Панковой, д. 1, тел.: 8 (0214) 51-47-86, +375 (212) 22-80-44.

Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 28.06.2024 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Кап. строение с инв. № 200/С-44994 площадью 2257 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 27, наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: три пристройки, подвал, сход в подвал, двое ступеней, крыльцо, столбы, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000002000155 площадью 0,1492 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 27/11 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – для обслуживания административного здания. Ограждение металлическое, инв. № 39036 по адресу: г. Витебск, ул. Комсомольская, 27/11. Регулятор температуры РТ-2010-04, зав. № 0057, инв. № 61190, теплосчетчик ТЭМ-05 МД-32, зав. № 11327, инв. № 2208, циркуляционный насос, инв. № 39046, счетчик электрической энергии ЭЭ 8005/6-К, зав. № 790022, инв. № 10902217, счетчик электрической энергии ЭЭ 8007/3, зав. № 784961, инв. № 10902218, счетчик электрической энергии ЭЭ 8005/2-К, зав. № 790207, инв. № 10902216, счетчик электрической энергии ЭЭ 8005/2-К, зав. № 790243, инв. № 10902216, счетчик холодной воды, инв. № 10902010, находящееся по адресу: г. Витебск, ул. Комсомольская, 27.

Нач. цена: 1 971 660,00 бел. руб. без учета НДС.

Задаток: 197 166,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 27.06.2024. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия электронных торгов: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов не позднее 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета эл. торгов. Расходы Продавца на проведение независимой оценки рыночной стоимости – 1491,24 бел. руб., в т. ч. НДС 20 %. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество – административные здания и помещения. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 29 815 51 45.

27 июня 2024 г. **№ 5-Н/2024**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права частной собственности на земельный участок в г. Гомеле

№ лота	Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель	Целевое назначение/ вид вещного права	Кадастровые номер, площадь земельного участка	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку док-ции, руб.	Наличие ограничений, обременений
1	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Красный Маяк У-360 (по генплану), ул. Краносельская, 36	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002184 0,0868 га	23 590,78	4 482,25	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, легкотипной хозяйственной постройки
2	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Красный Маяк У-418 (по генплану), ул. Кольцевая, 11	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002053 0,0803 га	21 952,14	4 170,91	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикаций, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, легкотипной хозяйственной постройки, части металлического забора на ленточном фундаменте смежного земельного участка по ул. Кольцевой, 12, части металлического забора смежного земельного участка по туп. Кольцевой, 5-й, 7
3	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-121 (по генплану), ул. Полякова И.Е., 13	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002377 0,0810 га	24 669,70	4 687,24	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, следов земляных работ
4	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-330 (по генплану), ул. Нарциссовая, 32	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002662 0,0810 га	20 604,24	3 914,81	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, следов земляных работ

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр».

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

3. **Аукцион состоится 27 июня 2024 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, индивидуальные предприниматели и юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.**

Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в ЦБУ №301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).

Перечень документов, предоставляемых участником:

4.1. заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам Республики Беларусь – копия паспорта, представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.2. представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1. в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством не законсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

6.2. после совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка (в случае предоставления земельного участка в аренду).

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 29 мая по 24 июня 2024 г. включительно. Дни приема: *понедельник, среда, пятница* с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**

Контактный телефон +375 232 30-12-46.

Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by, газета «Звязда», «Гомельские ведомости»

ООО «СидНеА» организует конкурсные торги

Дата и время проведения	Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды)	Начальная цена (в бел. руб. эквивалентная по курсу НБ РБ на день проведения торгов)	Общая площадь	Конкурсное обеспечение в бел. руб.	Срок заключения договора купли-продажи/ аренды
26.06.2024 11.00	Продажа квартиры с инв. № 500/D485629 по адресу: г. Минск, ул. М. Лынькова, 99/1-22	44900	34,5 кв. м	10	90
повторные конкурсные торги					
26.06.2024 12.00	Продажа квартиры с инв. № 614/D-27319, по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Гавриила Тихова, д. 9, кв. 47	53000	59,4 кв. м	10	90
Изменение условий по объекту торгов					
17.06.2024 11.00	Продажа дома с инв. № 620/С-46411, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Негорельский с/с, д. Мостище, ул. Центральная, 56А	84900	96.1 кв. м	10	90

Торги состоятся по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов.

Телефон для справок (+37529) 171-50-50.

УНП 193734126

Уважаемые акционеры ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»!

7 июня 2024 года в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ» по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (актовый зал).

Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
2. Об условиях проведения закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
3. О результатах закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
4. О внесении изменений в Устав ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
5. О внесении изменений в Положение о наблюдательном совете открытого акционерного общества «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».

Реестр акционеров для участия в собрании акционеров будет сформирован по состоянию на 31 мая 2024 г.

С материалами по вопросам повестки для собрания, лица, имеющие право на участие в общем собрании акционеров, могут ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 в следующем порядке:

- с 31.05.2024 по 06.06.2024 в рабочие дни с 9.00 до 16.40 с перерывом 12.00 до 12.30 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, каб. 304А,

- в день проведения собрания – 07.06.2024 – с 9.00 до 15.30 по месту его проведения.

Регистрация участников собрания будет осуществляться **7 июня 2024 г. с 15.00 до 15.45** по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».

УНП 100258980

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ИНСТИТУТУ ФИЗИКИ НАН Беларуси** на праве оперативного управления **(Продавец)**

Аукцион состоится **27.06.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Лот № 1, в составе:

1. Легковой седан «Фольксваген Пассат В6», кузов (рама) № WVWZZZ3CZ7P083771.
2. Комплект резины на литых дисках (б/у, 4 штуки).

Начальная цена с НДС 20 % – 12 175,39 руб.

Место нахождения: г. Минск, пр-т Независимости, 68-2.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» Организатора аукциона (gostorg.by).

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Поставский льнозавод»**

Аукцион состоится **18.06.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: Линия длинного льноволокна «Vanhauwaert»

(перечень имущества, входящий в состав Лота № 1, содержится на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).

Место нахождения Лота № 1: Витебская обл., г. Поставы, ул. Заводская, 1. Обременение: залог.

Начальная цена с НДС 20 % – 622 451,35 руб. Задаток – 82 993,51 руб. Шаг аукциона – 3 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 14.06.2024 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182